**МІ́НСКІ ПАЛА́Ц РЭСПУ́БЛІКІ**. Пабудаваны ў 1986—2001 у Мінску (аўтарскі калектыў: М.Пірагоў, В.Данілаў, Л.Зданевіч, Л.Маскалевіч, В.Новікаў, М.Турлюк, В.Усімаў, А.Шабалін з удзелам І.Бізюка, К.Філіповіча). Выступае сувязным звя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ном прасторы гіст. цэнтра горада і сучаснай забудовы, з'яўляецца дамінантай ансамбля Кастр. плошчы. Архіт.-маст. вырашэнне будынка засн. на падтрыманні класічных прынцыпаў узведзеных на плошчы пабудоў. У аснове праекта — старажытнагрэч. перыпцер — прамавугольны ў плане будынак, акружаны па перыметры магутнымі парталамі пілонаў. Вобразнае вырашэнне манум. аб'ёму-прызмы адлюстроўвае ўплыў архітэктуры рацыяналізму. Пілоны падтрымліваюць перакрыцце памерам 109,5 × 82,5 м. Фасады запоўнены вітражным шклом. Палац мае шматзальную аб'ёмна-планіровачную структуру, уключае вял. глядзельную залу (на 2700 месцаў), малыя глядзельныя залы, канферэнц-залы, кінакомплекс у трох узроўнях, урадавы і прэзідыума блокі, кафэ, бары, більярдны клуб, дапаможныя і тэхн. памяшканні. Зручнасць камунікацый забяспечваюць адкрытыя ўрачыстыя лесвіцы ў фае, 6 эскалатараў паміж узроўнямі фае і кулуараў. Дызайн інтэр'ера вытрыманы ў бела-залацістых тонах. У афармленні памяшканняў выкарыстоўваюцца дэкар.-асвятляльныя элементы (мастакі В.Даўгяла, Ю.Івахнішын, В.Стэльмашонак, В.Чайка), габелены (мастакі В.Бартлава, Н.Пілюзіна, В.Грыдзіна, В.Крывашэева, Г.Крываблоцкая). Будынак адпавядае тэхніка-акустычным патрабаванням сучасных масавых прадстаўленняў, забяспечвае патрэбы пры правядзенні масавых урачыстых мерапрыемстваў — форумаў, з'ездаў, асамблей, кангрэсаў, сімпозіумаў, арганізацыю выстаў, канцэртаў, фестываляў, спектаклей, выступленне оперных і балетных калектываў.

*Ю.Ю.Захарына.*



*Мінскі Палац Рэспублікі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ